# УНИВЕРСИТЕТСКОЕ ОБРАЗОВАНИЕ: ОПЫТ ТЫСЯЧЕЛЕТИЯ, ПРОБЛЕМЫ, ПЕРСПЕКТИВЫ РАЗВИТИЯ

Тезисы докладов
II Международного конгресса

г. Минск, 14-16 мая 2008 г.

В двух томах

2 том

Н.У. Магер (г. Пінск, Рэспубліка Беларусь)

## САМАСТОЙНАЯ РАБОТА ЯК ЭЛЕМЕНТ ПРАФЕСІЙНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ СПЕЦЫЯЛІСТА

Адной з асноўных задач сучаснай вышэйшай школы з'яўляецца падрыхтоўка спецыяліста, які валодае інтэлектуальнай ініцыятывай, здольнага самастойна набываць веды і нараджаць новыя. У сувязі з гэтым узрастае роля самастойнай работы студэнтаў як адной з важнейшых форм арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці.

На сучасным этапе фарміраванне ўмення працаваць самастойна набывае выключнае значэнне, якое выражаецца ва ўзмацненні індывідуальнага падыходу і развіцці творчых здольнасцяў будучых спецыялістаў у апоры на іх самастойную работу.

З псіхалогіі вядома, што веды, атрыманыя самастойна, шляхам пераадолення пасільных цяжкасцяў, засвойваюцца больш трывала, чым атрыманыя ў гатовым выглядзе ад выкладчыка, бо ў ходзе самастойнай работы кожны непасрэдна сутыкаецца з засвойваемым матэрыялам, канцэнтруе на ім усю сваю ўвагу, рэзервы інтэлектуальнага, эмацыянальнага і валявога характару. Акрамя таго, што самастойная работа выклікае актыўнасць студэнтаў, яна яшчэ і носіць індывідуалізіраваны характар. Кожны выкарыстоўвае крыніцу інфармацыі ў залежнасці ад сваіх уласных патрэб і магчымасцяў. Гэта ўласцівасць самастойнай работы надае ей гнуткі адаптыўны характар, што значна павышае адказнасць кожнага асобнага студэнта і, такім чынам, яго паспяховасць.

У рацыянальным выкарыстанні самастойнай работы хаваецца таксама і значны патэнцыял для павышэння матывацыі. Выкладчык уздзейнічае на студэнтаў ускосна, дазваляючы ім адчуваць сябе актыўнымі суб'ектамі навучання. Самастойная работа тым больш паспяховая, чым больш добраахвотны яе характар. Таму выкладчык павінен ствараць толькі падставы для зараджэння ў навучэнцаў патрэбы ў ей.

Выклікаўшы матыў і стварыўшы цікавасць да самастойнай работы, выкладчык імкнецца да трывалага засваення ведаў студэнтамі, развіцця ўменняў і навыкаў, з аднаго боку, і, з другога – да фарміравання прыемаў вучэбнай працы, якія ствараюць прадпасылкі

для бесперапыннай адукацыі – неад'емнай умовы пастаяннага папаўнення якасных сучасных ведаў.

Пры правільнай арганізацыі самастойная работа мае рашаючае значэнне для развіцця самастойнасці як адной з вядучых рыс будучага спецыяліста, якая павінна забяспечыць для студэнта:

- трывалае засваенне ведаў па прадмеце;
- авалоданне спосабамі і прыемамі самаадукацыі;
- развіццё патрэбы ў самастойным папаўненні ведаў.

Дзякуючы самастойнай рабоце, пры правільнай і эфектыўнай яе арганізацыі, рашаецца шырокі спектр задач навучання, які можа служыць фактарам павышэння яго эфектыўнасці. Самастойная работа выступае як дзейнасць студэнта, накіраваная на поўнае засваенне вучэбнай праграмы, і прадугледжвае развіцце пэўных уменняў і навыкаў, прадуктыўнага мыслення, пазнаваўчай актыўнасці і патрэбы ў самаадукацыі. Абавязак кожнага выкладчыка – стварыць умовы для развіцця мэтавых і валявых установак, рэфлексіі, праяснення і прыняцця каштоўнасцяў. Неабходна паказаць студэнтам, што патрэба ў безупынным пошуку, актуальных ведаў, іх захаванні, перапрацоўцы і распаўсюджанні з'яўляецца адной з важнейшых прафесійных кампетэнцый будучага спецыяліста.

Такім чынам, у сучасных умовах падрыхтоўка будучага спецыяліста павінна быць звязана з неабходнасцю фарміравання ў іх самаадукацыйнай кампетэнцыі як адной з кваліфікацыйных характарыстык, адсутнасць якой здольна зніжаць і іншыя складальнікі прафесійнай кампетэнцыі.